# Нацыянальная бібліятэка Беларусі даўно вырасла са свайго будынка

***Інтэрв'ю з дырэктарам Нацыянальнай бібліятэкі Галінай АЛЕЙНІК***



Праект новага будынка
Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

**— Якія сёння ўмовы для збору айчынных і замежных кніг, часопісаў і газет?**

— Мы атрымліваем абавязковы экземпляр усяго, што выходзіць з-пад друкаванага станка на Беларусі. Гэта забяспечвае закон, такая практыка ва ўсіх нацыянальных бібліятэках свету. Адпаведна мы складаем і нацыянальную бягучую, рэтраспектыўную бібліяграфію, таму ў многіх краінах функцыі нацыянальнай бібліятэкі аб'яднаны з функцыямі кніжных палат. У нас жа пакуль гэтая работа дубліруецца, хаця пры аб'яднанні гэтых функцый у адной установе можна было б амаль удвая скараціць затраты.

Складана з расійскімі выданнямі. З пачатку свайго існавання і да 1995 года мы з Расіі атрымлівалі абавязковы экземпляр, а потым вымушаны былі кнігі і перыёдыку закупляць. Фінансавыя абмежаванні, на жаль, вымушаюць да скарачэння аб'ёмаў камплектавання кніг, а таксама падпіскі на перыядычныя выданні. У 2000 годзе з-за недахвату сродкаў мы адмовіліся ад 268 назваў расійскіх часопісаў. Скарачэнне паступлення кніг і рэпертуару перыядычных выданняў безумоўна перашкаджае выкананню нацыянальнай бібліятэкай яе галоўнай задачы — забеспячэння карыстальнікаў найбольш поўным спектрам інфармацыйных прадуктаў высокай навуковай якасці і, зразумела, інтэлектуальна збядняе краіну.

**(Заканчэнне на 3-й стар.)**

# Нацыянальная бібліятэка Беларусі даўно вырасла са свайго будынка

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Папаўненне фондаў замежнымі выданнямі вядзецца ў асноўным праз міжнародны кнігаабмен. Нацыянальная бібліятэка супрацоўнічае з 325 партнёрамі ў 48 краінах свету. Але тут узнікаюць цяжкасці з перасылкай. Каб запакаваць кнігу і паслаць — трэба пошце заплаціць больш, чым каштуе сама кніга. Каб атрымаць кнігу з-за мяжы і растаможыць яе, нам трэба заплаціць не толькі вялікія грошы, але яшчэ і затраціць шмат часу і нерваў. Напрыклад, каб прывезці ў бібліятэку апошні том цудоўнай нямецкай энцыклапедыі па мастацтву, падораную нам, трэба было заплаціць пошліну ўдвая большую, чым кошт кнігі, потым заверыць у натарыуса давернае даручэнне і самім ехаць у аэрапорт за гэтай кнігай.

На гэты год бібліятэцы вызначылі валютныя фонды, значыць, удасца набыць каштоўныя замежныя часопісы і электронныя базы даных. Сёння бібліятэка атрымлівае электронныя поўнатэкставыя копіі артыкулаў з 200 назваў англамоўнай перыёдыкі па грамадскім навукам. Мы маем так званую рэфератыўную перыёдыку — базу даных, якая ахоплівае асноўныя англамоўныя рэфератыўныя выданні па сацыяльных і гуманітарных навуках, бізнесу, пытаннях адукацыі.

Часткова кампенсуюць нехватку расійскай кнігі і перыёдыкі політэматычныя базы даных Інстытута навуковай інфармацыі па грамадскіх навуках, бібліяграфічныя базы даных Расійскай кніжнай палаты. Летась Нацыянальная бібліятэка набыла 167 назваў электронных баз даных, усяго ў яе фондах сёння 666 такіх баз, з іх 70 бібліяграфічных, 11 заканатворчых, 40 даведачных і энцыклапедычных, 35 навукова-адукацыйных, 20 па мастацтву. Электронныя базы каштуюць дорага, але яны вельмі патрэбныя нашым наведвальнікам.

Гэта тое, што датычыцца новых кніг. Другая (ці першая) з нашых галоўных задач — гэта збор і захаванне ўсёй беларускай кнігі за ўсе часы яе гісторыі. На жаль, тут вельмі шмат прабелаў. Так склаўся лёс беларускай кнігі, што большасць дарэвалюцыйных выданняў знаходзяцца ў буйнейшых бібліятэках былога Саюза, у Польшчы. Мы працуем з бібліятэкамі Санкт-Пецярбурга і Масквы, марым аб камандзіроўках у бібліятэкі Вільнюса і Варшавы. Вяртаем кнігі хаця б у выглядзе ксеракопій, фотакопій, у электронным варыянце. Праз два гады спадзяёмся завяршыць работу над каталогам і рэпертуарам беларускай кнігі за 400 гадоў кнігадрукавання з 1517 года. Мы складаем яго па крупінках.

> ***Даведка:***
>
> *Статус нацыянальнай буйнейшая бібліятэка Беларусі набыла толькі дзевяць гадоў таму, хаця ўсе функцыі яе выконвала з дня свайго ўтварэння ў верасні 1922 года. Нацыянальная бібліятэка адрозніваецца ад усіх іншых тым, што яна забяспечвае максімальна магчымую паўнату ўсіх дакументаў, надрукаваных у Беларусі, усяго, што выходзіць у іншых краінах і датычыцца Беларусі, з мэтаю вечнага іх захоўвання, а таксама ўсіх замежных выданняў, неабходных для развіцця нацыянальнай навукі, культуры і адукацыі. Нацыянальная бібліятэяка Беларусі вядзе прыкладныя навуковыя пошукі ў галіне бібліятэчнай справы, з'яўляецца інфармацыйным, каардынацыйным цэнтрам для іншых бібліятэк краіны, праводзіць значную асветніцкую работу. Фонды Нацыянальнай бібліятэкі сёння налічваюць звыш 7,5 тысячы адзінак. На працягу года ў яе паступае каля 100 тысяч новых экземпляраў, і гэты паток штогод расце.*

**— Новыя тэхналогіі змянілі стыль работы ў Нацыянальнай бібліятэцы, Вы ўжо расказалі, як электронныя базы даных пашыраюць магчымасці атрымання інфармацыі. Якія яшчэ станоўчыя вынікі камп'ютэрызацыі і наколькі цяжка яна праходзіла?**

— У бібліятэцы з'явіліся новыя паслугі, палепшылася іх якасць, пашырылася відавая разнастайнасць дакументаў, з'явілася магчымасць набыцця электронных рэсурсаў. Карыстаюцца попытам платныя паслугі: запіс інфармацыі на дыскі, ксеракапіраванне, стварэнне бібліяграфічных спісаў. Гэта дазваляе часткова акупіць расходныя матэрыялы і, што даволі важна, дапамагае захаваць фонды.

Трэці год мы працуем са зводным электронным каталогам на базе нацыянальнай бібліятэкі і Навуковай бібліятэкі АН. Мы амаль дасягнулі сумяшчальнасці з электроннымі каталогамі бібліятэк розных сістэм і ведамстваў. На жаль, у нас пакуль няма нармальнага выхаду ў INTERNET, дзякуючы якому Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі маглі б карыстацца ў любой кропцы краіны і за яе межамі. Як і мы маглі б карыстацца каталогамі бібліятэк свету.

Наколькі цяжкім быў гэты пераход да камп'ютэра? Некаторыя сталыя нашы чытачы так яго і не адолелі. Гэта псіхалагічна цяжка. Маладыя прыстасаваліся хутка. Машын не хапае, таму збіраюцца чэргі. Самі бібліятэкары аваладалі тэхнікай надзіва лёгка, думаю, дзякуючы сваёй гуманітарнай адукацыі, і яны ўвесь час ідуць далей, самаразвіваюцца і захапляюцца новымі магчымасцямі.

Але сам будынак не прыстасаваны для новых тэхналогій, і ўстанавіць машыны было вельмі цяжка.

**— Пытанне з будынкам так і не зрушылася з мёртвага пункту?**

— Мы вельмі спадзяёмся на запэўніванне прэзідэнта аб тым, што новы будынак Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі будзе пабудаваны. Новы корпус павінны былі здаць яшчэ ў 1996 годзе, але пакуль нават не выканана яго праектная дакументацыя. Сёння нам выдзелілі на гэта 20 мільёнаў рублёў, а на завяршэнне праекта патрэбна 600 мільёнаў. Калі грошы будуць паступаць такімі тэмпамі, мы рызыкуем нарадзіць яшчэ адзін вельмі пакутлівы даўгабуд.

Новы будынак бібліятэцы патрэбен як паветра. Бо стары разлічаны на 2,5 мільёна адзінак захоўвання, а ў нас іх ужо амаль 8 мільёнаў. 70 працэнтаў нашых фондаў прадстаўлена адзінкавымі экземплярамі. Тут цесна і людзям, і кнігам. Мы нейкімі саматужнымі сродкамі падтрымліваем рэжым для рэдкіх кніг. Да нас маюць прэтэнзіі пажарнікі, я кожны дзень малюся, каб яшчэ колькі «вытрымалі» трубы, бо ацяпляльная сістэма праходзіць пад кнігасховішчам, а асноўнаму корпусу амаль 70 гадоў, дадатковаму корпусу — 40. У нас ужо былі аварыі, і залівала кнігі вадой. Ды і ўвогуле, не такой павінна быць сучасная нацыянальная бібліятэка еўрапейскай дзяржавы, гэта ж як і нацыянальны музей, і нацыянальны тэатр — «візітоўка» краіны.

**— Новы будынак, напэўна, даў бы магчымасць работы ў бібліятэцы і інвалідам?**

— Канешне. Пакуль для слабавідушчых людзей, для «калясачнікаў» багацце нацыянальнай бібліятэкі недасягальнае, а значыць, мы не можам гаварыць аб роўных магчымасцях.

**— Ці маюць супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі добрыя стымулы для сваёй работы тут?**

— Пакуль што гэтыя стымулы пераважна духоўныя. Вельмі цяжка прыцягнуць і ўтрымаць маладых бібліятэкараў. Працаваць тут надзвычай цяжка, за дзень бывае да 1300 наведвальнікаў. У нас амаль заўсёды чэргі. Бібліятэкары вымушаны працаваць, нібы аўтаматы. Акрамя ж працы з чытачамі мы вядзём вялікую навуковую і выдавецкую дзейнасць. Штогод Нацыянальная бібліятэка выпускае каля 30 розных дапаможнікаў. Разам з Інстытутам славяназнаўства і балканістыкі Расійскай акадэміі навук, Польскай акадэміяй навук нашы супрацоўнікі ажыццяўляюць навуковую праграму «Кніжная культура Падляшша», ствараюць аўтаматызаваную базу даных «Рэдкая кніга», вядуць пошукі рэдкай кнігі і фарміруюць каштоўныя калекцыі. Мы рыхтуем зварот у Міністэрства культуры аб аднясенні бібліятэкі да ліку навукова-вынаходніцкіх устаноў І катэгорыі, каб хоць як-небудзь падтрымаць нашу навуковую працу.

**— Спадзяюся, што нарада з дзеячамі культуры і прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі Беларусі, якую напярэдакні студзеня правядзе прэзідэнт Беларусі, дапаможа вырашыць асноўныя праблемы Нацыянальнай бібліятэкі...**

— Мы таксама спадзяёмся, бо гэта забяспечыць адну з умоў развіцця культуры і гаспадаркі нашай краіны.

**Гутарку вяла Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**